**19.** Якое слова-антонім прапушчана ў спалучэнні?

*Ручай вузкі, а рака … .*

**А)** празрыстая. **Б)** вузейшая. **В)** шырокая. **Г)** доўгая. **Д)** імклівая.

**20.** Выберыце словы, у якіх 3 літары і 3 гукі.

*1) люк; 2) яма; 3) лью; 4) Мая.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**21.** З назваў якіх дзвюх літар можна прыгатаваць страву?

*1) д; 2) к; 3) м; 4) ш.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**22.** Якія назвы дзён тыдня напісаны няправільна?

*1) аўторак; 2) среда; 3) чацвер; 4) суббота.*

**А)** усе назвы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**23.** Дадзены назвы: *а) сасоннік; б) гай; в) дуброва.*
Суаднясіце з іх значэннямі:

*1) ліставы лес са значнай колькасцю дубоў; 2) сасновы лес; 3) невялікі, часцей ліставы лес.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

**24.** Вызначце па малюнках адгадкі на загадкі.

*а) Без станка і без рук, а кросны тчэ. б) На паляне сіняй пасецца конь сівы. в) Стаіць у лазе на адной назе.*

1)  2)  3) 

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»

КОНКУРС

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 2. Тыраж 5400 экз. Мінск. 2025 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2025»

*Чацвер, 13 лютага 2025 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 2 класа

**1.** Якія словы маюць адзін склад?

*1) снег; 2) луг; 3) звон; 4) цень.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**2.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Ульвяняцільвіцамаці.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**3.** Выберыце імёны хлопчыкаў.

*1) Маша; 2) Міша; 3) Антон; 4) Аліна.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**4.** Якую літару неабходна паставіць паміж літарамі ***б..к***, каб атрымалася назва жывёлы?

**А)** а. **Б)** о. **В)** э. **Г)** ы. **Д)** у.

**5.** Адгадайце загадку:

*Яна галодная – хата халодная,*
*Яна пад'ела – у хаце пацяплела.*

**А)** страха. **Б)** печ. **В)** гаспадыня. **Г)** дзетвара. **Д)** госця.

**6.** Якія словы пачынаем пісаць з галоснай літары?

*1) дуб; 2) ясень; 3) сасна; 4) асіна.*

**А)** няма такіх слоў. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**7.** Падлічыце, колькі ўсяго **[ш]** у словах скорагаворкі.

*На машыне па шашы едзе дзед у капелюшы.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**8.** Знайдзіце назвы *а) арэлі; б) дзьмухавец; в) цыбуля* на малюнках.

*1)*  *2)*  *3)* 

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

**9.** Як назваць адным словам *ваўка, сабаку, тыгра*?

**А)** людзі. **Б)** расліны. **В)** жывёлы. **Г)** з'явы прыроды. **Д)** рэчы.

**10.** Прачытайце ўважліва радок з верша Уладзіміра Дубоўкі:

*Кожнае **слова** вякамі стварана.*

На якое пытанне адказвае выдзеленае слова?

**А)** хто? **Б)** што? **В)** каго? **Г)** чаго? **Д)** (аб) чым?

**11.** Якія імёны нельга перанесці пры напісанні?

*1) Рая; 2) Клава; 3) Ала; 4) Шура.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**12.** Дадзены словы: *1) кветка; 2) вёска; 3) авёс; 4) месца.*
Выберыце словы з літарай ***ё***.

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**13.** Выберыце словы, якія абазначаюць дзеянне.

*1) глядзець; 2) жоўты; 3) пець; 4) светлы.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**14.** Дадзены назвы прафесій:

*а) урач; б) настаўнік; в) муляр.*

Што яны робяць? Выберыце патрэбныя варыянты.

*1) будуе дамы; 2) вучыць дзяцей; 3) лечыць людзей.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

**15.** Як называецца жыллё для шпакоў?



**А)** гняздо. **Б)** дупло. **В)** шпакоўня.
**Г)** падстрэшак. **Д)** страха.

**16.** У якім слове на месцы пропуску дзве літары ***шш***?

*1) збо..а; 2) узвы..а; 3) кало..е; 4) карэ..е; 5) бага..е.*

**А)** у 1. **Б)** у 2. **В)** у 3. **Г)** у 4. **Д)** у 5.

**17.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Якуба Коласа:

*Пабяліла зіма і палі, і лугі,*
*І сады, і лясы, і над рэчкай стагі.*

Колькі назоўнікаў у форме множнага ліку тут ужыта?

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**18.** На якія пытанні адказваюць прыметнікі?

*1) які?; 2) чый?; 3) што?; 4) хто?;*
*5) што рабіць? 6) што зрабіць?*

**А)** 1, 2. **Б)** 2, 3. **В)** 3, 4. **Г)** 4, 5. **Д)** 5, 6.